## Герой Беларусі — вышэйшае дзяржаўнае званне



Як незалежная краіна Беларусь мае і свае ўзнагароды. Іх уручаюць тым, хто здзейсніў нешта надзвычайнае на карысць людзям і краіне.

Бадай, самай ганаровай узнагародай з'яўляецца залаты медаль Героя Беларусі. Гэта званне прысвойваецца за выключныя дасягненні і смелыя ўчынкі.

Першым, хто атрымаў званне Героя, стаў ваенны лётчык **Уладзімір Карват**. Коштам свайго жыцця ён выратаваў жыцці многім людзям.

Здарылася так, што на вучэннях яго самалёт загарэўся. Па інструкцыі лётчык мусіў катапульціравацца. Але герой вырашыў спачатку адвесці небяспеку ад вёскі, на якую ляцела машына. Пакінуць палаючы самалёт ён не паспеў.



За падобны ж подзвіг званне Героя Беларусі ў 2021 годзе атрымалі **Андрэй Нічыпарчык** і **Мікіта Куконенка**. Зноў на вучэннях самалёт стаў падаць — адмовіла сістэма кіравання. Перад лётчыкамі паўстаў выбар: пакінуць машыну альбо пастарацца адвесці яе ўбок ад жылых дамоў, куды самалёт падаў.

Да апошняга змагаліся лётчыкі з непаслухмянай машынай. І пакінулі борт, толькі калі ўпэўніліся, што самалёт не зачэпіць будынкі. Але было ўжо позна — і Андрэй, і Мікіта загінулі.

Званне Героя Беларусі атрымліваюць не толькі за выратаванне жыццяў. Яго прысвойваюць і за вялікі ўнёсак у развіццё эканомікі, самаадданую працу на карысць Радзімы, выключныя дасягненні ў розных сферах. У тым ліку і спорце, навуцы, культуры.

На сённяшні дзень Героямі Беларусі з'яўляюцца 13 чалавек.